УДК [94:339.174 + 39](476)»18»

# ГАНДАЛЬ ЛЕСАМ І ЛЕСАМАТЭРЫЯЛАМІ Ў СІСТЭМЕ ЭКАНАМІЧНЫХ ПРАКТЫК ПАМЕСНАГА ДВАРАНСТВА БЕЛАРУСІ Ў XIX ст.

**Шыдлоўскі С. А.**
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
(г. Полацк, Беларусь)

Анатацыя. У дадзеным артыкуле ў гістарычнай перспектыве разглядаецца развіццё айчыннай традыцыі гандлю лесам і лесаматэрыяламі ў кантэксце эканамічных практык паместнага дваранства Беларусі. Даследуюцца асноўныя кірункі і каналы вывазу лесу за мяжу; прасочваецца дынаміка змены аб'ёмаў экспарту. Прыводзяцца знешнія і ўнутраныя фактары, якія ўплывалі на гандлёвыя практыкі памешчыкаў. Характарызуюцца негатыўныя праяўленні ў гандлі лесам.
Ключавыя словы: гандаль лесам і лесаматэрыяламі, гандлёвыя традыцыі, паместнае дваранства.
Summary. This article in a historical perspective examines the development of the domestic tradition of trade in timber and timber products in the context of economic practices of the landowners of Belarus. The main directions and channels of forest export abroad are investigated; The dynamics of changes in export volumes is traced. The external and internal factors that influenced the trading practices of the landowners are given. Negative manifestations in forest trade are characterized.
Keywords: Trade in timber and timber products, landowners of Belarus, history of trade

Галоўнымі артыкуламі экспарту з беларускіх губерняў у XIX ст. былі лес і прадукты перапрацоўкі драўніны (пераважна сасна і піламатэрыялы, выробленыя з яе), а таксама дзёгаць і смала для патрэб заходнееўрапейскага, у прыватнасці нямецкага, караблебудавання. Далей па аб'ёме экспарту ішлі жыта, пшаніца, каноплі (семя і пянька), лён і ільняное семя, валы, мёд, воск [7, с. 62; 10, s. 67].

Больш разгорнуты пералік мясцовых прадуктаў, якія прапаноўваліся на продаж замежным спажыўцам, прадстаўляе І. Ляхніцкі, паводле звестак якога, у 1817 г. (ад сакавіка да верасня) па Нёману ў Кёнігсберг прайшло 124 віціны, 43 паўвіціны, 443 плыта з жытам, пшаніцай, аўсом, ячменем, грэчкай, просам, гарохам, ільняным семем і вотруб'ем, канапляным семем, грэцкімі і ячнымі крупамі, тытунём, ільном, пянькой, пакляй пяньковай, а таксама ільняной, вяроўкамі пяньковымі ды ільнянымі, парусным палатном, мочаным рагозам, рагозавымі мяшкамі, таплёным салам, сальнымі свечкамі, ільняным маслам, гарэлкай, авечай воўнай, мёдам, паташом, сасновымі брусамі, сасновым бярвеннем, дубовымі клёпкамі, дубовымі дошкамі [11, s. 72]. Па Заходняму Бугу перавозілася жыта, пшаніца, авёс, ячмень, крупы грэчкі, таплёнае сала, тытунь, паташ, сасновыя брусы, сасновае бярвенне, дубовыя клёпкі і дошкі [11, s. 74]. Па Заходняй Дзвіне ў Рыгу везлі сала, лес, ільняное семя, пяньку, хлеб, тытунь, прадукты дрэваапрацоўкі [3, с. 367]. Замежным попытам карысталася нават рыззё, якое ў Коўна вывозілі яўрэі для продажу немцам. Апошнія выкарыстоўвалі гэтую сыравіну на прускіх фабрыках для вырабу паперы [14, s. 159].

Зімой лес звозіўся да румаў (складоў). Там дрэвы маглі звязвацца загадзя па некалькі бярвён для веснавога сплаву. Лес сплаўляўся як у выглядзе плытоў, так і самасплавам – без увязвання бярвення. Існавалі розныя спосабы вязання дрэва – «глейнамі», «лавамі», «грабёнкамі», «клейнамі». Большая частка плытоў аснашчалася стырном, вёсламі і будай [1, с. 17–24]. Вясной з вызваленнем беларускіх рэк ад ільду



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пачынаўся сплаў лесу – пераважна да балтыйскіх портаў (Гданьску, Кёнігсбергу, Клайпеды, Рыгі). Многія беларускія рэкі можна было выкарыстоўваць толькі пасля паводкі – для веснавога сплаву (ад пачатку навігацыі да сярэдзіны мая). Такім чынам вясна з'яўлялася найбольш інтэнсіўным перыядам у вывазе лесу. Паводле слоў К. Тышкевіча, толькі на адной Вяллі сплавам кожную вясну займаліся тысячы работнікаў. Буйныя рэкі працягвалі эксплуатавацца і пад час летняга сплаву – ад сярэдзіны мая і да канца навігацыі [14, s. 30].

Паводле звестак А.П. Жытко і М.М. Забаўскага, экспарт лесу з Беларусі ў 1861–1914 гг. ішоў пераважна ў паўднёвым і заходнім кірунках [4, с. 95–96]. На мяжы ХІХ–ХХ стст. існавала тэндэнцыя да павелічэння сплаву лесу да портаў Гданьска, Клайпеды і Кёнігсберга [5]. На прускія порты былі арыентаваны ў першую чаргу маёнткі, якія знаходзіліся каля Нёману і яго прытокаў (у першую чаргу Вяллі і Шчары). Аб'ёмы сплаву лесу па Заходняй Дзвіне хутка павялічваліся з сярэдзіны ХІХ ст. Так, за 1855 г. праз Віцебск па Дзвіне сплавілі 820 плытоў, у 1866 г. – 5 212, а ў 1890 г. – 10 904 [6, с. 98]. У кірунку Рыгі сплаўляліся плыты таварнага дрэва, мачты, брус (найчасцей англійскі – звычайна квадратны ў сячэнні), драўляныя палі, дошкі, клёпкі [13, s. 110, 217].

Лес, які быў нягодны для сплаву ў Рыгу ці нямецкія порты, ішоў на выраб калод, бэлек, дошак, жардзін ці на патрэбы ацяплення. Апошняя прадукцыя адпраўлялася ў Кіеў і Крамянчуг [12, s. 11−12]. Напрыклад, з Міншчыны сплаў вёўся па прытоках Вяллі ў Клайпеду, а па Бярэзіне – на Рыгу і Крамянчуг [14, s. 30].

Гандлем, арганізацыяй нарыхтоўкі і вывазу лесу займаліся амаль выключна яўрэі. Новыя людзі ў гандлі лесам і лесаматэрыяламі неслі страты. Напрыклад, продаж смалы ў Крамянчугу прыносіў прыбытак каля паўтара рубля срэбра з бочкі. Аднак мясцовыя пакупнікі разлічваліся не адразу, а на працягу трох месяцаў. Часта набывалі ў крэдыт, часткова расплачваючыся таварамі, а рэшту аддавалі праз год і болей. Калі згаджаліся на выплату ўсёй сумы гатоўкай, то па меншай цане. На гэтых умовах смалой маглі гандляваць толькі прафесіянальныя купцы [9, s. 58; 10, s. 63]. Аб'ектыўныя цяжкасці разам з негатыўнымі стэрэатыпамі ў дачыненні заняткаў камерцыяй і перспектыў «хуткага абагачэння» [8, с. 181] адахвочвалі памеснае дваранства ад ажыццяўлення непасрэднага кантролю над лясным гандлем.

Былі спробы ўваходжання ў мясцовы лясны гандаль замежнага капіталу. Так, паводле звестак К. Кантрыма, у 1793 г. англійская кампанія набыла Тураў і тамтэйшыя ўладанні генерала Селягіна з мэтай вырубкі лесу і сплаву яго праз Херсон. Гэты праект планавалася пашыраць на бліжэйшыя палескія землі ўздоўж Прыпяці. Аднак праз тры гады дзейнасці расійскі ўрад вымусіў іх разарваць кантракт, вярнуўшы грошы і забраўшы Тураў ва ўласнасць дзяржавы. Англічане адмовіліся і ад іншых зямель на Палессі [9, s. 7–8].

Мясцовы прадукт нярэдка не адпавядаў шэрагу крытэрыяў, якія існавалі на заходнееўрапейскім рынку. Так, палескі паташ прайграваў у Англіі і Францыі амерыканскаму, бо амерыканскія вытворцы расфасоўвалі свой прадукт у невялікія герметычныя скрынкі, якія карысталіся попытам у заходнееўрапейскіх пакупнікоў, у адрозненні ад ёмістых і негерметычных палескіх скрынь [9, s. 59]. Мясцовая дубовая клёпка, якую выраблялі прыгонныя, не вельмі добра разыходзілася на знешніх рынках з-за неадпаведнасці яе памераў тым, што патрабаваліся ў заходнееўрапейскіх краінах [9, s. 58].

Рост вырубак прыводзіў да затаваранасці – мясцовае дрэва ў балтыйскіх портах не знаходзіла ў поўным аб'ёме збыт, што правакавала зніжэнне кошту як дрэва, так і аплаты работ за рубку і сплаў лесу [12, s. 9]. З іншага боку, з 30-х па 60-я гг. ХІХ ст. цэны на лес у пэўных рэгіёнах Беларусі (асабліва ўздоўж сплаўных і суднаходных рэк) падняліся у некалькі разоў, што было звязана з абязлесеннем тэрыторый [2, с. 15].

Такім чынам, пры высокай даходнасці ляснога гандлю памешчыкі не маглі рэалізаваць лес з максімальнай для сябе выгадай, бо, як правіла, яны не мелі свабоднага капіталу, каб займацца гандлем самастойна, і звярталіся да пасрэднікаў, якія забіралі значную частку даходу. Аднак пры ўсіх хібах гандаль лесам гарантаваў памешчыкам высокі даход, што часам прыводзіла да занядбання імі менш даходных галін сельскай гаспадаркі – паляводства і жывёлагадоўлі.

**Літаратура:**


1. Аникиевич, К.Т. Сенненский уезд Могилёвской губернии : опыт описания в географическом, историческом, этнографическом, бытовом, промышленном и статистическом отношениях, с картой уезда, схемой двух озёр и рисунками в тексте / К.Т. Аникиевич. — Могилёв : Губернская типография, 1907. — 149 с.
2. Бобровский, П.О. Физические и нравственные элементы северо-западных губерний России / П.О. Бобровский // Вестник Западной России. — Вильно. — 1865. — Г. IV. — Кн. IV. — Ч. 3. — С. 1–17.
3. Довнар-Запольский, М.В. История Белоруссии / М.В. Довнар-Запольский. — Минск : Беларусь, 2003. — 680 с.
4. Жытко, А.П. Гаспадарча-эканамічная дзейнасць памеснага дваранства Беларусі. 1861 – 1914 гг. / А.П. Жытко, М.М. Забаўскі // Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму : у 5 ч. — Ч. 3. — Мінск : БДПУ, 2008. — С. 32–110.
5. Котов, Б.С. Русско-германские торговые отношения накануне первой мировой войны в оценке русской прессы / Б.С. Котов // Вопросы истории. — 2012. — № 2. — С. 104–118.
6. Никифоровский, Н.Я. Странички из недавней старины города Витебска: Воспоминания старожила / Н.Я. Никифоровский ; текст. подгот. А.М. Подлипского. — Минск : Полымя, 1995. — 149 с.
7. Севергин, В.М. Записки путешествия по западным провинциям Российского государства, или Минералогические, хозяйственные и другие примечания, учинённые во время проезда через оные в 1802 году... / В.М. Севергин. — СПб: Типография Императорской Академии наук, 1803. — 225 с.
8. Шыдлоўскі, С.А. Шляхецкі этас у творах А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш» і Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня» / С.А. Шыдлоўскі // Acta albaruthenica : Навуковы зборнік / пад агул. рэд. М. Хаўстовіча [і інш.]. — Выпуск пяты. — Мінск : Права і эканоміка, 2005. — С. 177—181.
9. Kontrym, K. Podróż Kontryma, urzędnika banku polskiego odbyta w roku 1829 po Polesiu / K. Kontrym ; Wydana przez Edwarda Raczyńskiego. — Poznań : U Walentego Stefańskiego, 1839. — 72 s.
10. Kraszewski, J. I. Wspomnienia Polesia, Wołynia i Litwy / J. I. Kraszewski. — Paryż : Nakładem J. K. Wilczynskiego, 1860. — 144 s.
11. Lachnicki, I. E. Statystyka gubernii litewsko grodzieńskiej / I. E. Lachnicki. — Wilno : Nakład i druk J. Zawadzki, 1817. — X, [2], 88 s.
12. Massaiski, E. T. Pan Podstolic, albo, Czém jesteśmy, czém być możemy : romans administracijny : W 5 częściach. Część 2 / E. T. Massalski. — Wilno : W Drukarni A. Marcinkowskiego, 1831. — 268 s.
13. Tyszkiewicz, E. Opisanie powiatu borysowskiego pod względem statystycznym, geognostycznym, historycznym, gospodarczym, przemysłowo-handlowym i lekarskim, z dodaniem wiadomości : o obyczajach, spiewach, przysłowiach i ubiorach ludu, gusłach, zabobonach itd. / E. Tyszkiewicz. — Wilno : Druk. A. Marcinowskiego, 1847. — 489, IV s.
14. Tyszkiewicz, K. Wilija i jej brzegi : pod względem hydrograficznym, historycznym, archeologicznym i etnograficznym / K. Tyszkiewicz. — Drezno : drukiem i nakładem Józefa I. Kraszewskiego, 1871. — XVI, 362 s.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова